**І. Н. КОЛАБАВА** (*Мінск*)

# СКАРБЫ ФАЛЬШЫВАМАНЕТЧЫКАЎ СА ЗБОРАЎ НУМІЗМАТЫЧНАГА КАБІНЕТА БЕЛАРУСКАГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА

Вядомыя на наш час сістэматызацыі манетных знаходак не вызначаюць асобнай групай скарбы, поўнасцю складзеныя з фальшывых манет[1]. У нумізматычным кабінеце БДУ захоўваюцца часткі двух такіх дэпазітаў.

25 студзеня 1493 г. магістр Лівонскага ордэна Іаган Фрайтаг фон Лорынгхофэн (1483—1494) так паведамляе рэвельскаму магістрату: «...нейкія рускія прыехалі ў Рыгу з Полацка, які ў Літве, маючы пры сабе фальшывыя манеты, адбітыя па ўзоры вендэнскіх (Вендэн [цяцер Цесіс] — разам з Рыгай, рэзідэнцыя магістра. — *І. К.*). На адным баку — герб, а на другім — рэвельскі крыж з кропкай. Аднаго з іх схапілі, і ён сказаў, што такіх манет адбіта палову ласта (каля 960 кг. — *І. К.*) і яны завезены да нас. Такім чынам... будучы папярэджанымі вышэйсказаным, засцеражыце сваіх месцічаў і гандляроў. І яшчэ, любыя падданыя, гэтыя фальшывыя манеты, мабыць, пасланы з Полацка ў Пскоў, каб пераслаць іх адтуль у нашу краіну... Узоры гэтых манет у запячатаным выглядзе дасылаем вам, каб вы іх агледзелі і змаглі засцерагчыся. Калі вам стане вядома, што нехта мае ці збывае фальшывыя манеты, прыцягвайце яго да адказнасці»[2].

Фальшывыя шылінгі адзначаны і ў «Хроніцы правінцыі Лівонія» 1584 г. рэвельскага пастара Бальтазара Русава, дзе згадваецца аб арышце ў 1494 г. лівонскіх купцоў за тое, што «рэвельцы аднаго рускага, адбіваўшага ў іх горадзе фальшывыя шылінгі, да смерці зварылі адпаведна Нямецкаму праву»[3]. Гэтае настолькі аддаленае ад апісваемай падзеі паведамленне нельга безагаворачна прымаць на веру: цяжка паверыць, што наўгародзец схітрыўся наладзіць такую рызыкоўную акцыю не ў параўнальна бяспечных «хатніх» умовах, а ў цэнтры Ордэна. Можна меркаваць, што ён прывозіў фальшывыя манеты з Полацка, з якім Ноўгарад, як і Пскоў, меў стабільныя гандлёвыя зносіны.

У грамаце 1493 г. і Хроніцы 1584 г. гаворка ідзе аб білонных шылінгах — самым абъёмным кампаненце грашовай гаспадаркі Лівоніі XV—XVI ст.

Улетку 1997 г. на калекцыянерскіх рынках Беларусі з'явілася значная колькасць фальшывых манет, якія мелі паводле існуючых звестак, паходжанне са знойдзенага «на беразе ракі ў Полацку» (верагодней за ўсе р. Палаты) скарбу.

Супастаўленне шэрагу фактаў (сведчанне вышэйзгаданых пісьмовых крыніц, канцэнтрацыя на тэрыторыі Полаччыны і Віцебшчыны беларускіх знаходак ордэнскіх манет, звесткі аб адкрытым у Полацку скарбе фальшывых манет) дазваляе зрабіць выснову аб існаванні ў Полацку падпольнага манетнага двара, які спецыялізаваўся на фальсіфікацыі шылінгаў Лівонскага ордэна.

14 падробак пад ордэнскія шылінгі Рэвеля з полацкага скарбу паступілі ў Нацыянальны музей гісторыі і культуры Беларусі (1 экз.), Нацыянальны Полацкі гісторыка-культурны запаведнік (1экз.), нумізматычны кабінет пры БДУ (6 экз.), прыватныя калекцыі (6 экз.)[4].

Даследаванне гэтых манет дазволіла адзначыць шэраг парушэнняў абавязковых нормаў тэхналагічнага працэсу іх выраблення, напрыклад значныя ваганні масы манет — ад 0,6 да 1,45 г пры норме 1,15 г з канца XV ст. да 1525 г. і 1,04—1,05 г з 1525 г. Дыяметр манет быў набліжаны да нормы і вагаўся ад 18,1 да 20,1 мм.

Правядзенне спектральнага аналізу вызначыла адсутнасць аднароднага сплаву, што прывяло да з'яўлення экземпляраў, выкананых з медзі (9 экз.), латуні з рэшткамі лужэння (2 экз.) і срэбра (1 экз. — проба вышэй за 500; 1 экз. — проба набліжана да 999)[5].

Параўнанне ўзроўню майстэрства выканання аверса і рэверса манет, якія даследаваліся, прывяло да высновы, што аўтарства фальшывых штэмпеляў належыць, безумоўна, двум рэзчыкам. Першы выконваў удалыя варыянты фальсіфікатаў, другі — непісьменныя падробкі.

Аналіз сямі штэмпеляў (два аверсных і пяць рэверсных) паказаў з'яўленне і паступовае павелічэнне на трох з іх (рэверсных) невялічкіх трэшчын, што дае магчымасць вызначыць паслядоўнасць чаканкі манет, адбітых пры іх удзеле.

Верагодны час выпуску «шылінгаў» скарбу 1997 г., як паказала даследаванне, — прамежак паміж 1540 і 1550 гг.[6]

Падробкі пад шылінгі, што паступілі ў Нумізматычны кабінет Лівонскага ордэна, з'яўляюцца паўфабрыкатамі, якія падлягалі далейшай апрацоўцы.

Пры магчымых пошуках дакладнага месца знаходкі скарбу і правядзенні адпаведных археалагічных даследаванняў адкрываецца магчымасць знаходкі рэшткаў майстэрні полацкіх фальшываманетчыкаў, якую можна лічыць першым манетным дваром на тэрыторыі Беларусі.

Паводле рашэння Венскага кангрэса 1815 г., на былой тэрыторыі герцагства Варшаўскага ствараецца Каралеўства Польскае, якому быў нададзены статус канстытуцыйнай манархіі на чале з расійскім імператарам.

З 1816 г. Варшаўскі манетны двор пачынае выпуск традыцыйных польскіх наміналаў у медзі (1, 3 гроша), білоне (1, 10 грошаў), срэбры (1, 2, 5, 10 злотых) і золаце (25, 50 злотых).

Залатыя і сярэбраныя манеты мелі партрэтную выяву Аляксандра I, а білоныя і медныя — выяву расійскага двухгаловага арла з аднагаловым польскім арлом на нагрудным геральдычным шчытку.

У ходзе паўстання, якое пачалося 29 лістапада 1830 г., было абвешчана аб перадачы Варшаўскага манетнага двара ў падпарадкаванне рэвалюцыйнага Польскага банка. 2 лютага 1831 г. прымаецца рашэнне аб выпуску манет новага тыпу з выявай герба Рэчы Паспалітай. З красавіка па жнівень 1831 г. Варшаўскі манетны двор выпускае медныя 3 грошы, білонныя 10 грошаў, срэбраныя 2 і 5 грошаў і залаты дукат (5 грошаў і 1 злоты былі чаканены ў пробным варыянце).

Пасля падаўлення паўстання ў верасні 1831 г. расійскі ўрад абвясціў аб забароне абарачэння срэбранай, білоннай і меднай «мяцежных» манет. Дукат быў пакінуты ў абарачэнні, таму што не меў выявы дзяржаўнага герба Рэчы Паспалітай[7].

26 лютага 1832 г. Канстытуцыя 1815 г. была скасавана, і Польшча пераўтвараецца ў звычайную тэрытарыяльна-адміністрацыйную адзінку Расійскай імперыі. 6 лютага 1839 г. Рада кіравання Каралеўствам Польскім адзначае, што «да сяго часу з усёй чаканенай манеты на суму 2123839 злотых паступілі ў Казначэйства і перачаканены на Манетным двары толькі на 1121646 злотых 21 грош». У сувязі з гэтым быў прапанаваны «працяг тэрміну канфіскацыі да 1 ліпеня бягучага году»[8].

Манеты паўстання 1830—1831 гг. сустракаюцца рэдка. На тэрыторыі Беларусі вядомы толькі тры выпадкі:

- г. п. Жалудок Гродзенскай вобл., 1908 — 1 злоты (верагодна, памылковае вызначэнне, таму што гэты намінал чаканіўся толькі ў пробным варыянце — гл. вышэй) і 2 злотых[9];
- г. Хойнікі Гомельскай вобл., 1965 г. — 2 злотых і дукат.

Захаванне: Нацыянальны музей гісторыі і культуры Рэспублікі Беларусь;

- пас. Бярэзіна Бабруйскага р-на Магілёўскай вобл., 1979 — 10 грошаў[10].

28 траўня 1971 г. у Рагачове падчас будаўнічых работ каля аўтобуснага вакзала быў знойдзены скарб, поўнасцю складзены з фальшывых манет, якія з'яўляліся паўфабрыкатамі — вынікам нясконченай працы фальшывыманетчыка. З гэтага скарбу, які ўтрымліваў каля тысячы манет, вядома 486 экз.[11]

У Нумізматычным кабінеце захоўваецца 483 манеты, якія прадстаўлены 1/12 талера 1766 г. (Прусія, манетны двор Магдэбург, Фрыдрых Вільгельм II [1744—1797]) — 135 экз., 10 грошамі (Польшча ў складзе Расійскай імперыі, Варшаўскі манетны двор, Мікалай I [1825—1855]) — 79 экз. (з іх 6 экз. — 1830, 21 экз. — 1831, 52 экз. — 183 [0? 1?]), 10 грошамі 1831 г. (паўстанне 1830—1831 гг., Варшаўскі манетны двор) — 269 экз.

Па адным «мяцежным» 10-грашовіку захоўваецца ва Уладзімірска-Суздальскім музее-запаведніку (г. Уладзімір), Дзяржаўным гістарычным музее (Масква)[12] і ў прыватнай калекцыі (Адэса)[13].

Манеты чаканены ў медзі, на некаторых бачны рэшткі серабрэння (сапраўдныя польскія прататыпы выконваліся з білону, а прускія — са срэбра).

Трэба адзначыць і поўную адсутнасць метралагічнай аднастайнасці (дыяметра, таўшчыні манетных кружкоў, масы) фальсіфікатаў: 1/12 таляра (маса 1,71—5,42 г, дыяметр 20,7—24,5 мм), 10 «законных» грошаў (маса 1,76—2,86 г, дыяметр 19,3—20,01 мм), 10 «мяцежных» грошаў (маса 0,9—3,63 г, дыяметр 17,0—21,7 мм).

У кожнай з названых вышэй манетных груп вызначана па некалькі пар штэмпеляў, якія выраблябліся пры дапамозе асобных пуансонаў.

На аверсе «мяцежных» 10-грашовікаў бачны бессэнсоўныя ініцыялы мюнцмайстара — «GR» (на сапраўдных — «KG» — Карл Гронаў — мюнцмайстар Варшаўскага манетнага двара [1830—1834])[14].

Аналіз почырка легенд сведчыць аб выкананні ўсіх падробак адным чалавекам, які здейсніў гэтую акцыю, вельмі рызыкоўную з палітычнага боку і бессэнсоўную эканамічна.

Да адкрыцця Рагачоўскага скарбу ў нумізматычным свеце не было вядома фактаў падробак манет Польскага паўстання 1830—1831 гг.

---

[1] *Потин В. М.* Введение в нумизматику // Труды Государственного Эрмитажа. Т. XXVI. Л., 1986. С. 108—109.

[2] *Hansrecesse.* Dritte Abteilung. Herausgegeben von Verein fur hansische Geschichte. Dritter Band. Leipzig. 1888. С. 103, № 153.

[3] *Russov B.* Chronica der provintz Lyfland. Bart, 1584 / Scriptores rerum Livonicarum. Riga; Leipzig, 1883. С. 32, № 22а.

[4] *Колобова И.* Полоцкий монетный двор XV — середины XVI вв. (фальсификация шиллингов Ливонского ордена) / Mennice miedzy Baltykiem a morzem Czarnym — Wspolnota dziejow. Materialy z III Miedzynarodowej Konferencji Numizmatycznej. Warszawa, 1998. S. 131—134; *Колобова И. Н., Рябцевич В. Н.* Фальсификация шиллингов Ливонского Ордена в Полоцке конца XV — первой половины XVI в. // Нумизматика на рубеже веков: Тр. Гос. истор. музея. Вып. 125. Нумизмат. сб. Ч. XV. М., 2001. С. 170—187; *Колабова І. Н.* Полацкі скарб 1997 г. / Гісторыя і археалогія Полацка і Полацкай зямлі. IV міжнар. канф. Полацк, 2002. С. 160—162; *Рябцевич В.Н.* Полоцкие фальшивомонетчики конца XV — первой половины XVI в. // VI Всерос. нумизмат. конф. М., 1998. С. 104.

[5] *Колобова И. Н., Рябцевич В. Н.*, 2001. С. 183—186.

[6] *Колобова И. Н., Рябцевич В. Н.* Фальсификация шиллингов Ливонского Ордена в Полоцке конца XV — первой половины XVI в. // Нумизматика на рубеже веков: Тр. Гос. истор. музея. Вып. 125. Нумизмат. сб. Ч. XV. М., 2001. С. 174—187.

[7] *Вел. кн. Георгий Михайлович.* Русские монеты, чеканенные для Польши. 1815—1841. СПб., 1893. С. 17.

[8] *Вел. кн. Георгий Михайлович*, 1893. С. 21.

[9] Архіў Дзяржаўнага Эрмітажа (СПб.). Ф. 1, воп. 5, спр. 18, 1908, арк. 66. Архіў Інстытута гісторыі матэрыяльнай культуры Расійскай акадэміі навук. (СПб.). Ф. 1, спр. 195, 1908, арк. 1, 3, 6.

[10] Ліст жыхара г. Бабруйска Н. П. Кузміча ад 1.01.1979 (захаванне: нумізматычны кабінет БДУ).

[11] *Колобова И. Н.* Рогачевский монетный клад 1971 г. / Всерос. нумизмат. конф. Вологда, 1993. С. 27—28; *Яна жа.* Варшавский монетный двор в 1816—1831 гг. / Всерос. нумизмат. конф. СПб., 1994. С. 115—116; *Яна жа.* Рогачевский монетный клад 1971 г. (основные итоги предварительного исследования) / III Всерос. нумизмат. конф. М., 1995. С. 36—37; *Яна жа.* Монеты восстания 1830—1831 гг. на территории Беларуси / Bialorus, Litwa, Polska, Ukraina. Wspolne dzieje pieniadza. Materialy z I Miedzynarodowej Konferencji Numizmatycznej. Warszawa, 1996. S. 133—135; *Яна жа.* Клады в собрании нумизматического кабинета Белорусского государственного университета / Rozwoj muzealnictwa i kolekcjonerstwa numizmatycznego — dawniej i dzis — na Bialorusi, Litwie, w Polsce i Ukrainie. Materialy z II Miedzynarodowej Konferencji Numizmatycznej. Warszawa, 1997. S. 125—126; *Яна жа.* Рогачевский монетный клад 1971 г. / Старажытнасці Рагачоўшчыны. Матэрыялы навук.-практ. канф. Мінск; Рагачоў, 2000. С. 76—77.

[12] *Колобова И. Н.*, 1995. С. 36—37.

[13] Лісты вядучага навуковага супрацоўніка Дзяржаўнага гістарычнага музея (Масква) У. У. Уздзенікава ад 5.04.1987 г. і 1995 г. (захаванне: нумізматычны кабінет БДУ).

[14] *Рябцевич В. Н.* Нумизматика Беларуси. Минск, 1995. С. 661.